УДК 070(476)(091)

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ РАДЫЁВЯШЧАННЯ БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1920-х гг.

***М. В. ПРАХАРЭНЯ***[1)]

[1)]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Аналізуюцца асаблівасці развіцця радыёвяшчання БССР у другой палове 1920-х гг. Прыводзяцца факталагічныя даныя, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, аб запатрабаванасці Мінскай радыёстанцыі сярод гарадской і сельскай аўдыторыі, колькасці радыёўстановак індывідуальнага і калектыўнага карыстання, характарызуецца мастацкі складнік радыёвяшчання. Разглядаецца дзейнасць «Беларускай радыёгазеты» як адной з найважнейшых форм палітычнага радыёвяшчання ў 1920-я гг. Акрэсліваюцца праблемы, якія былі характэрны для працы Мінскай і Гомельскай радыёстанцый ў дадзены перыяд. Вылучаюцца мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне зместу і якасці радыёперадач, павышэнне аўтарытэту радыёвяшчання сярод слухачоў. Абазначаюцца падыходы да масавай радыёфікацыі тэрыторыі БССР у канцы 1920-х гг.

***Ключавыя словы:*** радыёвяшчанне ў 1920-я гг.; радыёвяшчанне БССР; «Беларуская радыёгазета»; Мінская радыёстанцыя; Гомельская радыёстанцыя; радыёфікацыя.

**Образец цитирования:**
Прахарэня МВ. Асаблівасці развіцця радыёвяшчання БССР у другой палове 1920-х гг. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2025;2:61–66.
EDN: MODZRU

**For citation:**
Prakharenya MV. Features of the development of radio broadcasting of the BSSR in the second half of the 1920s. *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2025;2:61–66. Belarusian.
EDN: MODZRU

**Автор:**
***Марина Валерьевна Прохореня*** – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры периодической печати и веб-журналистики факультета журналистики.

**Author:**
***Maryna V. Prakharenya,*** PhD (philology), docent; associate professor at the department of periodical press and web journalism, faculty of journalism.
*prakhar@bsu.by*
*https://orcid.org/0000-0002-0718-0564*

CC BY NC

# ОСОБЕННОСТИ РАЗВИТИЯ РАДИОВЕЩАНИЯ БССР ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ 1920-х гг.

***М. В. ПРОХОРЕНЯ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Анализируются особенности развития радиовещания БССР во второй половине 1920-х гг. Приводятся фактологические данные, которые хранятся в Национальном архиве Республики Беларусь, о востребованности Минской радиостанции среди городской и сельской аудитории, количестве радиоприемников индивидуального и коллективного пользования, характеризуется художественная составляющая радиовещания. Представляется информация о деятельности «Белорусской радиогазеты» как одной из важнейших форм политического радиовещания в 1920-х гг. Обозначаются проблемы, характерные для работы Минской и Гомельской радиостанций в этот период. Выделяются мероприятия, направленные на улучшение содержания и качества радиопрограмм, повышение авторитета радиовещания среди слушателей. Излагаются подходы к массовой радиофикации территории БССР в конце 1920-х гг.

***Ключевые слова:*** радиовещание в 1920-х гг.; радиовещание БССР; «Белорусская радиогазета»; Минская радиостанция; Гомельская радиостанция; радиофикация.

# FEATURES OF THE DEVELOPMENT OF RADIO BROADCASTING OF THE BSSR IN THE SECOND HALF OF THE 1920s

***M. V. PRAKHARENYA***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The peculiarities of the development of radio broadcasting in the BSSR in the second half of the 1920s are considered. On the basis of archival materials, actual data on the popularity of the Minsk radio station among urban and rural audiences, the number of radio receivers for individual and collective use, and the artistic component of radio broadcasting are given. The article provides information on the activities of the «Belarusian radio newspaper» as one of the most important forms of political radio broadcasting in the 1920s. Problem characteristics of Minsk and Gomel radio stations during this period are indicated. Activities aimed at improving the content and quality of radio programmes, increasing the authority of radio broadcasting among listeners have been named. Approaches to mass radiography of the territory of the BSSR in the late 1920s are described.

***Keywords:*** radio broadcasting in the 1920s; radio broadcasting of the BSSR; «Belarusian radio newspaper»; Minsk radio station; Gomel radio station; radiofication.

## Уводзіны

Станаўленне рэгулярнага радыёвяшчання на тэрыторыі нашай краіны пачалося ў 1924–1925 гг., калі ў Мінску, Гомелі, Оршы і іншых беларускіх гарадах радыёаматары ўстанавілі дэтэктарныя прыёмнікі і слухалі Маскоўскую радыёвяшчальную станцыю. Блізкасць да Масквы давала магчымасць атрымліваць устойлівы сігнал [1]. У канцы 1924 – пачатку 1925 г. у эксплуатацыю была ўведзена Гомельская радыёстанцыя імя І. В. Сталіна, якая ў асноўным рэтрансліравала маскоўскую праграму [2].

Згодна з планам агульнасавецкага радыёбудаўніцтва і пашырэння сеткі радыёстанцый у БССР прымаюцца тэрміновыя меры па будаўніцтве магутнай перадавальнай станцыі. Так, 15 лістапада 1925 г. пачала сваю дзейнасць Мінская радыёстанцыя імя Саўнаркама БССР. Газета «Звезда» (з 1927 г. «Звязда») 17 лістапада 1925 г. паведамляла: «Станция охватывает радиусом своего действия 300 верст. Все места в Беларуси будут, таким образом, обслужены. Даже Смоленск и Гомель воспринимают работу нашей станции… Вся установка обошлась в 25 тыс. рублей». У матэрыяле адзначалася, што ў гэты час у Мінску меліся каля 400 індывідуальных радыёпрыёмнікаў і 20 клубных установак з гучнагаварыцелямі, кожная з якіх была разлічана прыблізна на 200 слухачоў.

Такім чынам, у 1925 г. са з'яўленнем рэгулярнага радыёвяшчання ў БССР пачынаецца новая эпоха ў сацыяльна-палітычным жыцці. Радыё стала важнай часткай існавання грамадства, яго культуры і быту.

Асноўным этапам станаўлення беларускай радыёжурналістыкі прысвечаны навуковыя працы вядомых даследчыкаў Я. Р. Радкевіча [1] і А. А. Плаўнік [2]. Творчы шлях Беларускага радыё прадстаўлены ў калектыўнай працы «Гаворыць і паказвае Беларусь» [3]. Працэс фарміравання радыёвяшчання ў кантэксце развіцця айчыннай журналістыкі абазначаны ў фундаментальнай рабоце А. Г. Слукі «Беларуская

журналістыка» [4]. Найважнешыя мерапрыемствы ў сферы радыёвяшчання адлюстраваны ў матэрыялах перыядычнага друку.

Мэта артыкула – вызначыць асаблівасці развіцця радыёвяшчання БССР у другой палове 1920-х гг., абапіраючыся на факталагічныя даныя аб функцыянаванні сістэмы радыёвяшчання ў 1920-я гг., матэрыялы аб дзейнасці Мінскай і Гомельскай радыёстанцый, якія прадстаўлены ў архіўных дакументах. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы: ахарактарызаваць працэс развіцця радыёвяшчання ў 1920-я гг., акрэсліць праблемы ў радыёвяшчанні ў другой палове 1920-х гг., вызначыць мерапрыемствы, што праводзіліся для паляпшэння зместу і якасці радыёперадач, а таксама павышэння аўтарытэту радыёвяшчання сярод слухачоў, абазначыць падыходы да масавай радыёфікацыі БССР у канцы 1920-х гг.

Метадалогія даследавання заснавана на крытычным асэнсаванні гістарычных крыніц, у якіх адлюстраваны працэс развіцця радыёвяшчання БССР у другой палове 1920-х гг. У якасці асноўных метадаў даследавання прымяняліся аналіз, сінтэз, дэдукцыя. Акрамя таго, былі выкарыстаны гісторыка-сістэмны (вызначэнне асаблівасцей развіцця радыёвяшчання ў другой палове 1920-х гг.), гісторыка-генетычны (вывучэнне радыёвяшчання ў працэсе развіцця) і лагічны метады.

## Асноўная частка

Асноўная задача радыё ў 1920-я гг. заключалася ў інфармаванні масавай аўдыторыі аб развіцці краіны, а таксама палітычным і культурным выхаванні слухачоў. У той час найбольш распаўсюджанымі былі такія формы перадач, як радыёгазеты, радыёчасопісы, лекцыі, гутаркі, даклады, тэматычныя канцэрты. Менавіта паляпшэнню іх зместу і якасці надавалася асаблівая ўвага ў першыя гады існавання радыёвяшчання.

У сакавіку 1928 г. ЦК КП(б)Б склі́каў рэспубліканскую нараду работнікаў радыё, на якой былі абмеркаваны пытанні развіцця радыёвяшчання. Адзначаліся пэўныя недахопы ў рабоце гэтай сістэмы, у сувязі з чым вясной – летам 1928 г. праводзіўся маніторынг працы Мінскай радыёстанцыі. Высновы і прапановы па ўдасканаленні радыёвяшчання адлюстраваны ў дакументах (справаздачах, дакладах, пратаколах пасяджэнняў, даведках, службовых лістах), якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь[1]. У дакладзе Наркамасветы БССР канстатавалася, што Мінская радыёстанцыя не карыстаецца аўтарытэтам сярод слухачоў. Так, у 1928 г. радыёстанцыя была запатрабавана ў 17 % гарадскіх слухачоў і толькі ў 7 % сельскіх. У той жа час Маскоўскую радыёстанцыю імя Камінтэрна слухалі 100 % як гарадской, так і сельскай аўдыторыі, замежнае вяшчанне выбіралі 33 % і 17 % слухачоў адпаведна. Сярод прычын невысокай зацікаўленасці кантэнтам беларускага радыёэфіра адзначаліся нізкая якасць зместу радыёперадач, непрафесійныя дыктары, адсутнасць звестак аб запытах аўдыторыі і ўліку яе сацыяльных і ўзроставых інтарэсаў[2].

Асаблівая ўвага надавалася дзейнасці «Беларускай радыёгазеты» як адной з найважнейшых форм палітычнага радыёвяшчання. У той час выданне мела наступныя штодзённыя аддзелы: «Перадавыя артыкулы», «Міжнародныя навіны», «Навіны СССР», «Навіны БССР», «Хроніка Мінска», «Радыёкуток і адказы сялянам»; паведамленні ў яўрэйскім, латышскім, літоўскім аддзелах выпускаліся штотыднёва. Было вызначана, што «Беларуская радыёгазета» выкарыстоўвала матэрыялы з друкаваных СМІ, не прыстасоўваючы інфармацыю для радыёэфіра. «Сухі стыль паведамленняў рабіў газету “нуднай для слухача”»[3], – сцвярджалася ў дакладзе. Акрамя таго, увага звярталася на рэдкае правядзенне кансультацый для радыёслухачоў, неадпаведнасць музычнага суправаджэння характару і зместу газеты, адсутнасць дысцыпліны ў дыктараў падчас трансляцыі. Дзейнасць іншых радыёгазет («Беларуская вёска», «Чырвоная змена», «Беларускі піянер») таксама трапіла пад крытыку. Для рэдакцый, якія іх рыхтавалі, былі характэрны адсутнасць плана работы, а таксама сухі стыль падачы матэрыялаў[4].

Акрамя таго, паведамлялася, што мастацкія праграмы Мінскай радыёстанцыі былі складзены шаблонна, аднастайна, музычныя нумары паўтараліся некалькі разоў на тыдзень, кваліфікацыя і прафесійны ўзровень аркестра і вакалістаў былі нізкімі. Даволі часта змест музычных трансляцый не адпавядаў заяўленай тэматыцы. Напрыклад, у сакавіку 1928 г. уверцюра да оперы П. Масканьі «Сельская часть» была пастаўлена ў эфір толькі таму, што ў яе назве ёсць слова «сельская». Аднак змест музычнага твора зусім не супадаў з запытамі сельскага слухача[5].

Сярод заўваг да працы Мінскай радыёстанцыі былі адсутнасць паўнавартаснага кантролю за выпускамі перадач – амаль усе дакладчыкі выступалі без падрыхтоўкі, парадак пакідання мікрафона не абазначаўся, гутаркі змяняліся адна за адной без папярэджвання аўдыторыі ў эфіры. Назіраліся рэгулярныя зрывы праграм па прычыне нез’яўлення

[1]Нац. арх. Рэсп. Беларусь (НАРБ). Ф. 4п.
[2]Там жа. Воп. 1. Спр. 4609. Арк. 22.
[3]Там жа. Спр. 4178. Арк. 21–24.
[4]Там жа.
[5]Там жа. Спр. 4609. Арк. 9.

дакладчыкаў (напрыклад, вясной 1928 г. у эфір не выйшла 75 % заяўленых дакладаў і гутарак). Здараліся выпадкі непрафесійнага перакладу матэрыялаў з рускай на беларускую мову, калі дыктар адразу зачытваў неадрэдагаваны тэкст у эфіры[6].

Праводзіўся маніторынг вяшчання і Гомельскай радыёстанцыі, якая пачала працу ў канцы 1924 г. У 1928 г. штат радыёстанцыі складаў 7 чалавек: загадчык радыёвяшчання, рэдактар, дыктар, 3 музыканты, справавод (для параўнання: штат Мінскай радыёстанцыі ўключаў каля 30 чалавек. – *М. П.*), штогадовы даход вагаўся ў межах 900–1000 руб. У цэлым яе дзейнасць ацэньвалася як паспяховая, дзякуючы таму, што невялікая па штаце радыёстанцыя трансліравала шмат уласнага кантэнту. Так, на Гомельскай радыёстанцыі з 6 да 8 гадзін раніцы перадаваліся мінскія праграмы, з 8 да 9 гадзін – уласныя, з 9 гадзін – маскоўскія праграмы. Напрыклад, у маі 1928 г. у эфіры Гомельскай радыёстанцыі гучалі «Рабочая радыёгазета» (выходзіла раз на 5 дзён), радыёгазета «Калгаснік» (раз на 7 дзён), «Вайсковая радыёгазета» (раз на 7 дзён), гутарка з рабселькарамі (2 разы на месяц), лекцыя па беларусізацыі (раз на месяц). Аднак як і ў Мінску, тут назіраліся значныя тэхнічныя праблемы: не хапала прафесійнага мікрафона, студыйнае абсталяванне знаходзілася ў дрэнным стане, не было кваліфікаванага радыётэхніка[7].

У хуткім часе быў прыняты шэраг спроб палепшыць якасць перадач Мінскай радыёстанцыі і павысіць яе аўтарытэт сярод насельніцтва. Са жніўня 1928 г. адбывалася паступовае ўдасканаленне зместу радыёпраграм, для гутарак і дакладаў падбіраліся актуальныя тэмы, якія адпавядалі запытам аўдыторыі. Тэматыка радыёэфіра набывала практычны характар. Так, на працягу жніўня – верасня 1928 г. выйшлі перадачы па аграноміі (12), ветэрынарыі (10), а таксама перадачы аб падатках (10), кааперацыі (8), сялянскай пазыцы (8) і інш. У сваю чаргу, рэдакцыя Мінскай радыёстанцыі ўказвала на пэўныя цяжкасці ў падборы дакладчыкаў і недахоп сродкаў для аплаты выступленняў спецыялістаў. Тым не менш назіралася паступавае павышэнне цікавасці аўдыторыі да трансляцый радыёстанцыі, паляпшалася зваротная сувязь са слухачамі. У верасні 1928 г. рэдакцыя атрымала 135 лістоў з водгукамі, а таксама каля 500 пытанняў, дакладныя адказы на якія прагучалі ў радыёэфіры ў рубрыцы «Рыдыёкуток і адказы сялянам». На найбольш запатрабаваныя тэмы былі падрыхтаваны паўнавартасныя выпускі, дзе адказы ці кансультацыі давалі кваліфікаваныя спецыялісты. Так, у радыёэфіры на сельскагаспарчыя пытанні адказвалі прафесійныя аграномы, на пытанні медыка-санітарнага характару – прадстаўнікі Дома санітарнай асветы Мінска, на пытанні юрыдычнага характару – члены фракцыі Мінскай акруговай калегіі адвакатаў[8].

Для павышэння якасці мастацкага вяшчання Мінскай радыёстанцыі на працу быў прыняты новы супрацоўнік – выпускнік музычнага тэхнікума. У выніку ў праграму былі ўключаны канцэрты для сялян (12), дзяцей (6), а таксама канцэрты, прысвечаныя культуры нацыянальных меньшасцей, якія пражывалі ў БССР (8), і гістарычным падзеям (4)[9]. Усяго з мая 1928 г. па студзень 1929 г. Мінская радыёстанцыя перадала 165 канцэртаў [3, с. 21]. Аднак ранейшыя праблемы мастацкага вяшчання часткова захаваліся: адсутнічалі ўласныя музычныя інструменты і сталы прафесійны аркестр, не хапала матэрыяльных сродкаў для аплаты высокакваліфікаваных вакалістаў.

У радыёэфіры паступова павялічвалася колькасць перадач на мовах нацыянальных меньшасцей. Адзначым, што паводле перапісу 1926 г. колькасць насельніцтва БССР складала 4 983 240 чал. (80,62 % складалі беларусы, 8,19 % – яўрэі, 7,70 % – рускія, 1,98 % – палякі, 0,14 % – літоўцы, 0,28 % – латышы, 0,69 % – украінцы, 0,15 % – немцы, 0,25 % – прадстаўнікі іншых народаў) [5, с. 60]. У дадзены гістарычны перыяд сродкі масавай інфармацыі з'яўляліся важным рэсурсам для ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі. Пасля 1925 г. на радыё, дзе асноўная частка праграм перадавалася на беларускай мове, была прапарцыянальная квота для вяшчання на мовах нацыянальных меньшасцей. Летам 1928 г. у радыёэфіры былі праведзены шэраг гутарак на розныя тэмы: аб кааперацыі (2) і аб дасягненнях БССР (2) на яўрэйскай мове, аб Беларускай сялянска-рабочай грамадзе (2) і дасягненнях польскай культуры ў БССР (2) на польскай мове і інш.[10]

Работа па далейшай радыёфікацыі тэрыторыі БССР разгарнулася ў 1928 г. Пашыралася сетка радыёстанцый і радыёвузлоў, ажыццяўляўся рамонт наяўных установак, гучнагаварыцеляў. Акрамя таго, вялася праца па паляпшэнні якасці і далёкасці радыёсігнала, паколькі слухачы скардзіліся, што «слышимость Минска неудачная. Нет звучности», «Минск – все равно как мотор», «в последнее время радиопередача стала скверной из-за частого шума, прерывания»[11].

У красавіку 1928 г. у БССР налічваліся 2492 радыёўстаноўкі, 2069 (83 %) з іх знаходзіліся ў гарадах, 423 (17 %) – у сельскай мясцовасці. У гарадах 89 % установак знаходзіліся ў індывідуальным карыстанні, 11 % – у калектыўным. У вёсках гэтыя паказчыкі

[6] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4609. Арк. 8.
[7] Там жа. Спр. 4612. Арк. 3.
[8] Там жа. Спр. 4609. Арк. 9–14.
[9] Там жа. Арк. 15.
[10] Там жа. Арк. 10.
[11] Там жа. Спр. 4612. Арк. 4.

склалі 72 % і 28 % адпаведна[12]. Адзначым, што асаблівая ўвага звярталася на развіццё радыёвяшчання і павелічэнне колькасці ўстановак з гучнагаварыцелямі (для калектыўнага выкарыстання) менавіта ў сельскай мясцовасці. Па падліках патэнцыяльная аўдыторыя радыёўстановак індывідуальнага карыстання складала прыкладна 6 500 чалавек. У сваю чаргу, радыёўстаноўкі калектыўнага карыстання (гучнагаварыцелі) ахоплівалі значна большую аўдыторыю – каля 17 тыс. чалавек[13].

Урад Беларусі надаваў першаступеннае значэнне радыёфікацыі вёскі, таму што там была сканцэнтравана большасць насельніцтва. Акрамя таго, ад сацыялістычных пераўтварэнняў на сяле залежала будаўніцтва асноў сацыялізму [4, с. 90]. У красавіку 1929 г. паводле рашэння ЦК КП(б)Б Белкаапсаюз атрымаў даручэнне распрацаваць прапановы паільготным крэдытаванні сельскаскагаспадарчых арганізацый для набыцця менавіта радыёўстановак калектыўнага карыстання[14].

У справе павышэння цікавасці вясковай аўдыторыі да радыёвяшчання дапамагалі студэнты, якія прыехалі на летні адпачынак. Была выпушчана брашура «Памятка студэнта-адпускніка», дзе тлумачылася, як трэба знаёміць сельскіх слухачоў з тым, што такое радыё, як карыстацца радыёпрыёмнікам. У рэдакцыях газет «Звязда», «Беларуская вёска», «Чырвоная змена» былі арганізаваны радыёкуткі. У акруговых газетах «Камуністычны шлях» (Аршанская акруга), «Віцебская сялянская газета» (Віцебская акруга), «Наш працаўнік» (Калінінская акруга), «Савецкая вёска» (Мазырская акруга), «Полоцкий пахарь» (Полацкая акруга) і іншых выданнях публікавалася праграма перадач Мінскай радыёстанцыі. З мэтай папулярызацыі радыё ў сельскай мясцовасці наладжваліся выезды радыёперасоўкі. Да пачатку кінасеансаў, якія ладзілі з дапамогай перавозных кінапраектараў, вясковая аўдыторыя слухала даклады, радыёгазеты, тэматычныя канцэрты і такім чынам знаёмілася з кантэнтам Мінскай радыёстанцыі.

Развіццё радыёвяшчання суправаджалася тэхнічнымі праблемамі: патрабаваліся рэгулярнае абслугоўванне і рамонт радыёўстановак, назіраўся недахоп кваліфікаваных спецыялістаў для ажыццяўлення гэтай справы. Па стане на 1 сакавіка 1928 г. у БССР працавалі толькі 249 гучнагаварыцеляў (83 % ад агульнай колькасці)[15], таму летам 1928 г. у Мінскую, Бабруйскую, Полацкую, Магілёўскую і Гомельскую акругі накіраваліся радыётэхнікі, якія ажыццяўлялі рамонт наяўных гучнагаварыцеляў і займаліся ўстаноўкай новых. Восенню 1928 г. такія спецыялісты адправіліся ў Мазырскую, Віцебскую і Аршанскую акругі. Акрамя таго, дзейнічала дамова з Белдзяржкіно, паводле якой устаноўку, тэхнічнае абслугоўванне і рамонт радыёўстановак маглі ажыццяўляць кінамеханікі[16]. Аднак нярэдка здараліся выпадкі недобрасумленнага стаўлення да гэтай справы з боку апошніх. Так, у газеце «Звязда» за 9 кастрычніка 1928 г. быў змешчаны матэрыял пра кінамеханіка Фірсанава. Ён устанаўліваў гучнагаварыцелі па завышаным кошце, але якасць аказаных паслуг была нізкай: «В Белбумтресте он взял за установку громкоговорителя 1800 руб., а в результате кроме глухого ворчанья ничего не слышно», – паведамлялася ў матэрыяле «Тысячи – на радиоветер».

Адзначым, што на тэрыторыі БССР у 1925–1928 гг. вяшчанне ажыццяўлялася таварыствам «Радыёперадача». Яго функцыі і задачы былі вызначаны наступным чынам: аб'яднанне радыёсправы ў краіне, арганізацыя шырокавяшчання, будаўніцтва і эксплуатацыя радыёстанцый, гандаль радыёапаратурай, выдавецкая і рэкламная дзейнасць[17]. Аднак уся тэхнічная база знаходзілася пад кантролем Наркамата поштаў і тэлеграфаў СССР. У такіх умовах таварыства «Радыёперадача» не магло забяспечыць выкананне задач па масавай радыёфікацыі, таму ў ліпені 1928 г. яно было ліквідавана. З гэтага часу радыёвяшчанне і радыёфікацыю курыраваў Наркамат поштаў і тэлеграфаў СССР. Пад кантролем гэтай установы прыступілі да арганізацыі праваднога радыёвяшчання, што паклала пачатак масавай радыёфікацыі тэрыторыі БССР. Паступова быў рэалізаваны шэраг мерапрыемстваў па пашырэнні сеткі радыёстанцый і радыёвузлоў, што спрыяла з'яўленню новых перспектыў для развіцця радыёвяшчання ў Беларусі. Радыё імкліва ўваходзіла ў палітычнае, эканамічнае і культурнае жыццё грамадства, павялічваліся эфірны час, колькасць перадач, пашыралася іх тэматыка.

## Заключэнне

Такім чынам, для развіцця радыёвяшчання БССР у другой палове 1920-х гг. характэрнымі з'яўляюцца наступныя асаблівасці: пастаяннае ўдасканаленне зместу радыёперадач, іх сэнсавай і стылістычнай адпаведнасці запатрабаванням аўдыторыі; вырашэнне кадравых праблем, што заключаліся ў падрыхтоўцы прафесійных дыктараў, рэдактараў радыёэфіра, а таксама кваліфікаваных тэхнічных спецыялістаў, якія маглі абслугоўваць радыёўстаноўкі і ажыццяўляць іх рамонт; пераадольванне тэхнічных

[12] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4609. Арк. 22.
[13] Там жа. Арк. 23.
[14] Там жа. Спр. 4178. Арк. 31.
[15] Там жа. Арк. 23.
[16] Там жа. Спр. 4609. Арк. 14.
[17] История советской радиожурналистики: документы, тексты, воспоминания. 1917–1945 / под ред. Т. Горяевой. М. : МГУ, 1991. С. 24–25.

праблем, арганізацыя добраякаснай перадачы радыёсігнала, павелічэнне яго далёкасці, павышэнне даступнасці радыёпрыёмнікаў і радыёўстановак для шырокага кола насельніцтва, радыёфікацыя сельскай мясцовасці. Адзначым, што ў гэты перыяд радыёвяшчанне таксама выконвала важную задачу: ва ўмовах непісьменнасці значнай часткі насельніцтва БССР не толькі інфармаваць шырокія масы аб важнейшых падзеях у краіне, але і ствараць умовы для палітычнага і культурнага развіцця грамадства.

Паступова беларускае радыёвяшчанне пераадолела ўсе цяжкасці, а высокапрафесійны калектыў, асвятляючы значныя падзеі ў гісторыі краіны, назапасіў каштоўны творчы вопыт, які стаў здабыткам айчыннай журналістыкі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Радкевіч ЯР. *Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця*. Мінск: БДУ; 1983. 198 с.
2. Плавник АА. Белорусское радио: 80 лет в эфире. У: Дубовік СВ, рэдактар. *Беларускае радыё: гісторыя, сучаснасць, перспектывы развіцця. Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Беларускага радыё; 20 снежня 2005 г.; Мінск, Беларусь.* Мінск: БДУ; 2005. с. 45–48.
3. Есіпенка ТФ, рэдактар. *Гаворыць і паказвае Беларусь*. Мінск: Беларусь; 1975. 240 с.
4. Слука АГ. *Беларуская журналістыка.* Мінск: БДУ; 2011. 447 с.
5. Центральная национальная комиссия ЦИК БССР. *Практическое разрешение национального вопроса в Белорусской Социалистической Советской Республике. Часть 1, Белорусизация*. Минск; 1927. 146 с.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 29.04.2025.*
*Received by editorial board 29.04.2025.*